ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

АЎТОРАК
14 сакавіка
1995 года
№ 4(1722)

● ЧАЛАВЕК ПЕРШАЙ ПАЛАСЫ

## «МНЕ ПАДАБАЕЦЦА ПРАЦАВАЦЬ ДОБРА...»

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» прадстаўляе прыгожую і цікавую жанчыну, якую ведае і паважае не адно пакаленне навукоўцаў універсітэта. Ларыса Паўлаўна Яноўская — загадчыца аддзела аспірантуры. Працуе ў аддзеле з 1967 года, а кіруе ім — з 1977-га. Можаце сабе ўявіць, калі Ларыса Паўлаўна пачынала працаваць у аддзеле, рэктар нашага універсітэта быў яшчэ толькі загадчыкам кафедры на хімічным факультэце.



**— Ларыса Паўлаўна, ці не знікае сёння ў нашай моладзі цікавасць да навуковай дзейнасці?**

— Як гэта ні дзіўна, але выпускнікі універсітэта імкнуцца паступіць у аспірантуру і вучыцца далей. У 1994 годзе, да прыкладу, з агульнага ліку аспірантаў 87 працэнтаў складаюць выпускнікі. Перш за ўсё гэта дае ім шанц хоць на некалькі гадоў вызначыць свой сацыяльны статус. Адразу знайсці добрую працу складана. Асабліва гэта тычыцца маладых людзей, што прыехалі да нас з перыферыі. Не кожнаму хочацца вяртацца дадому з чырвоным дыпломам, калі ёсць магчымасць адразу паступіць у аспірантуру.

**— А колькі ўсяго людзей вучыцца ў нашай аспірантуры?**

— Цяпер — 390 чалавек: 260 на дзённай форме навучання і 130 на завочнай. Ёсць яшчэ такая форма, як саіскальніцтва. Выбіраецца тэма, кафедра, кіраўнік навуковай працы. І чалавек працуе. Тэкіх у аспірантуры — каля 400 чалавек. Саіскальніцтва прываблівае і тым, што не трэба здаваць уступныя іспыты. Але калі за год чалавек нічога не зрабіў і не здаў ніводнага экзамена кандыдацкага мінімуму, звычайна мы выключаем яго з ліку саіскальнікаў.

Наогул, з цягам часу ў працэсе навучання назіраецца адток з аспірантуры, часцей за ўсё — з дзённай у завочную. Стыпендыя аспіранта — 91 тысяча рублёў. Заплаціць за інтэрнат, падаходны падатак. А калі гэта яшчэ і маладая сям'я... Мы разумеем, як цяпер складана займацца навукай. Раней, да прыкладу, аспірант у свой індывідуальны план уключаў некалькі камандзіровак па ўсяму былому Саюзу. Ішоў натуральны абмен інфармацыяй у шырокім навуковым асяродку. Цяпер няма чыма з'ездзіць нават у Вільню без вялікіх цяжкасцей, у Маскву. Трэба, каб усё наладзілася, каб маладыя навукоўцы адчулі патрэбу ў сваёй дзейнасці, каб мы не згубілі гэты невялікі патэнцыял імкнення да навукі.

**— Ларыса Паўлаўна, ці шмат у нас навучэнцаў з-за мяжы?**

— Усяго 46 замежнікаў. Яны плацяць за сваё навучанне — 2 тысячы долараў у год на дзённай форме, і 1800 долараў — на завочнай. Калі затрымліваюцца яшчэ на некалькі месяцаў, даплочваюць па 200 долараў за кожны месяц. Канешне, цяпер геаграфія краін не такая вялікая, як раней. Але для людзей з усходніх краін, з афрыканскага кантыненту нашае навучанне падаецца танным. Дарэчы, ёсць і палякі, і балгары.

**— Ларыса Паўлаўна, Вы працуеце ў аспірантуры столькі гадоў... Ці не хацелася Вам змяніць працу?**

— Мне не падабаецца скакаць з места на места, вандраваць з адной працы на другую. Я заўсёды думаю пра тое, што з новай працай прыйдзецца вельмі доўга звыкацца, вучыцца ёй. Іншыя людзі, традыцыі. А я не магу губляць на гэта час. Я люблю працаваць добра...

**— Ларыса Паўлаўна, я ведаю, што Вы спяваеце ў народным хоры народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта...**

— Так. Ужо 15 гадоў спяваю ў хоры. Дзве гадзіны паспяваеш, пагутарыш, і робіцца лягчэй на душы.

**— Калі можна, некалькі слоў пра Вашу сям'ю...**

— Так сталася, што яна шчыльна звязана з вышэйшай школай. Муж, Міхаіл Захаравіч Яноўскі,— загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі ў інстытуце культуры. У сына Андрэя — ужо свая сям'я. Мы вельмі любім унучку Любушу, якой ужо год з паловай.

**— Ці падабаецца Вам займацца якімі-небудзь хатнімі справамі?**

— Люблю. І гатаваць, і па гаспадарцы. Але на ўсё павінен быць пэўны настрой.

Гутарыла
**Таццяна КАЗАК.**

## Палажэнне аб конкурсе на лепшы фотаздымак і лепшую публікацыю ў газеце «Беларускі універсітэт», прысвечаным 50-годдзю Перамогі

1. Матэрыялы на конкурс прадастаўляюцца ў машынапісным выглядзе ў аб'ёме не больш за 3—4 друкаваныя старонкі.

2. Да конкурсу прымаюцца матэрыялы толькі студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ.

3. Фатаграфіі, прадастаўленыя на конкурс, павінны быць чорна-белымі, кантрастнымі, на глянцавай паперы, любога памеру.

4. Рэдакцыя пакідае за сабой права адбору матэрыялаў для друку.

5. Матэрыялы да разгляду прымаюцца да 23 красавіка 1995 года. Матэрыялы, прадастаўленыя пазней азначанага тэрміну, разглядацца не будуць.

6. Пераможцы конкурсу атрымаюць грашовыя прэміі за лепшы фотаздымак:
І прэмія — 5 мінімальных заробкаў
ІІ прэмія — 3 мінімальных заробкі
ІІІ прэмія — 2 мінімальных заробкі
І прэмія за лепшую публікацыю — 7 мінімальных заробкаў
ІІ прэмія — 5 мінімальных заробкаў
ІІІ прэмія — 3 мінімальныя заробкі

7. Матэрыялы на конкурс прымаюцца па адрасу: г. Мінск, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411—412. Тэл. 20-68-27. Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт».

## Віншуем!



*У сакавіку першы прарэктар Пётр Дзмітрыевіч Кухарчык святкуе сваё 50-годдзе. З гэтай нагоды мы віншуем юбіляра, жадаем яму моцнага здароўя, плённай працы на навуковай ніве, поспехаў у грамадскай дзейнасці, здзяйснення ўсіх добрых пачынанняў.*

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў; фізічнага выхавання і спорту; медыцынскай падрыхтоўкі; геадэзіі і картаграфіі; фізічнай геаграфіі і аховы прыроды; замежнай журналістыкі і літаратуры; крымінальнай; паліталогіі; сацыялогіі; вышэйшай матэматыкі; методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: філасофіі і метадалогіі навукі; фізічнай хіміі; сусветнай і айчыннай гісторыі; лазернай фізікі і спектраскапіі (0,25 стаўкі);

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі новага і найноўшага часу; археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; інфарматыкі; прыкладной лінгвістыкі; неарганічнай хіміі; арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ; гісторыі філасофіі і логікі; вышэйшай матэматыкі; матэматычнай фізікі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: матэматычных метадаў тэорыі кіравання; нямецкай мовы;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вылічальнай матэматыкі; аналітычнай хіміі (0,5 стаўкі).

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, т. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце «Беларускі універсітэт» 14 сакавіка 1995 года.

## Дырэкцыя ліцэя пры Белдзяржуніверсітэце

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ВЫКЛАДЧЫКА ГЕАГРАФІІ

ВЫКЛАДЧЫКА ХІМІІ

ВЫКЛАДЧЫКА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

ВЫКЛАДЧЫКА АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ

ВЫКЛАДЧЫКА ФІЗВЫХАВАННЯ

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220006, Мінск, вул. Маякоўскага, 96, ліцэй пры Белдзяржуніверсітэце, аддзел кадраў, тэл. 21-04-30

Аб'ява надрукавана ў газеце «Беларускі універсітэт» 14 сакавіка 1995 года.

# «НАМ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА»

***«...good by, Америка!» — гэтая песня для пакалення 80-х стала гімнам і часткова прысудам. «Услышу ли песню, которую запомню навсегда!» Так, мы спяваем іншыя песні. А тая, «застойная», шмат для каго з мары ператварылася ў рэальнасць. Якую? На гэтае пытанне кожны, хто быў там, дае свой адказ. Ваня Андрыянаў, студэнт IV курса фізфака, год правучыўся ў Штатах, у Норвічскім Універсітэце. Што скажа ён?..***



**— А паміж сабой адносіны амерыканскіх студэнтаў якія? Ці ёсць адрозненні ад узаемаадносін нашых студэнтаў?**

— Так, розніца ёсць. У кожнай навучальнай установе існуе кодэкс гонару: не падманвай, не крадзі і г. д. І ёсць яшчэ адзін вельмі цікавы пункт: не падтрымліваць таго, хто гэта робіць. Іншымі словамі, праінфармаваць выкладчыка пра нейкае парушэнне — гэта твой абавязак.

**— Значыць, тое, што ў нас называецца «нашасцярыць», там лічыцца абсалютна нармальным?**

— І правільным.

**— А ты можаш прывесці прыклад, калі нормы паводзінаў іх студэнтаў не супадаюць з нашымі?**

— Так, вось вельмі яскравы прыклад. Была кантрольная. Я і яшчэ адзін рускі хлопец з Санкт-Пецярбурга пісалі адкрыта, не хаваючы свае аркушы. Тады як амерыканскія студэнты закрывалі іх. Прайшло хвілін дзесяць. Падымаецца амерыканскі студэнт, нервова паглядзеў на майго сябра і кажа: «Ці не маглі б Вы закрыць свой аркуш, каб яго ніхто не бачыў?»

**— Ваня, што ты можаш увогуле сказаць аб іх сістэме адукацыі?**

— Я хачу сказаць, што нам ёсць чым ганарыцца. Калі я з'язджаў туды, я разлічваў павысіць свой узровень ведаў. Але гэтага не адбылося. Наадварот, я пачаў рэзка губляць кваліфікацыю. Што мяне здзівіла? Часам на пытанні, якія цікавілі мяне, выкладчыкі не маглі даць выразны адказ.

**— Ці часта гэта было тут?**

— Нейкі адказ я атрымліваў заўсёды. Не заўжды разумеў яго, але атрымліваў. А ўвогуле, склалася такое ўражанне, што ў нас узровень выкладання тэхнічных дысцыплін вышэйшы. Такія веды, якія я атрымліваю ў нашым універсітэце, там я магу атрымаць у лічаных ВНУ. І яшчэ. Я ўжо сказаў, што нам ёсць чым ганарыцца. Аднак гэта тычыцца не толькі адукацыі, але і ўсіх бакоў нашага жыцця.

**— Ваня, як адбылося вяртанне на Радзіму?**

— Я перажыў шок, вярнуўшыся дадому.

**— Чаму? Ад таго, што паспеў прызвычаіцца да тых правілаў жыцця, вучобы і адвыкнуць ад сваіх?**

— Менавіта. За гэты год я выпаў з нашай плыні і моцна змяніўся. І знешне, і ў поглядах на некаторыя рэчы адбыліся перамены. Я стаў, скажам, больш грамадзянінам свету. Цяпер я не разумею нацыяналізму. Зносіны з моладдзю з усіх канцоў свету прымусілі мяне па-іншаму паглядзець на сусвет. І наша маленькая дзяржава — зараз для мяне толькі маленькая частка Зямлі.

**— Даляглядь некалькі пашырыліся?**

— Так, у Брэсце свет не заканчваецца. Што яшчэ змянілася?.. Знікла глыбокая пашана перад Захадам. Яна ж сядзіць у шмат якіх людзях. Маўляў, назбіраю грошай, з'еду, і мне там будзе добра. Але... можа так здарыцца, што нідзе добра не будзе. Усё залежыць ад чалавека, а не ад месца, дзе ён знаходзіцца.

**— Пасля таго, як ты там ужо троху пажыў, ужо мог параўноўваць, якія пачуцці ў цябе ўзніклі ў дачыненні да дому?**

— Мне шмат чаго там не хапала. Не хапала нашага пачуцця супольнасці, тусовачнасці, ці што... Калі браць інтэрнат, як правіла, там сярэдні студэнт у межах свайго пакоя і сядзіць. Ёсць, канешне, кампаніі. Але ў цэлым амерыканцы — вялікія індывідуалісты. Такога, як у нас, калі цябе бяруць у ахапак і цягнуць на вечарынку, няма. Там гэтага не разумеюць. Трэба дамаўляцца загадзя. Яны вельмі замкнутыя ў сабе, і нават за бутэлькай іх не разгаворыш.

Запісала
**М. ГУЛЯЕВА**

**Фотаздымкі
Аляксея СУПРУНА.**



# Беларускі раманіст

## (Да 90-годдзя з дня нараджэння Ф. М. Нячая)

Фёдар Макаравіч Нячай нарадзіўся 9 сакавіка 1905 года ў сяле Дзяражычы Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і селяніна. Некалькі гадоў ён працаваў сельскім настаўнікам. Пасля службы ў Чырвонай арміі Ф. М. Нячай паступіў у Растоўскі педагагічны інстытут, які скончыў у 1937 годзе і тады ж быў залічаны ў аспірантуру Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава. Пад кіраўніцтвам знакамітага гісторыка А. В. Мішуліна ў 1940 г. была паспяхова абаронена кандыдацкая дысертацыя «Саюзніцкая вайна ў крыніцах». Крыніцы заўсёды былі асновай любых даследаванняў Ф. М. Нячая. Пазней, у 1963 г. адносіны Рыма з саюзнікамі знайшлі распрацоўку ў манаграфіі «Рым і італікі» (Мінск, 1963). Вучоны абгрунтавана даказаў, што рымскі горад-дзяржава (цывітас) пашыраўся за кошт анексіі тэрыторыі шматлікіх народаў. Праводзячы палітыку «раздзяляй і ўладарнічай», Рым стварыў рымска-італійскую федэрацыю. Яна забяспечвала роўныя і няроўныя саюзныя дагаворы, унутранае самакіраванне ў саюзнікаў, вызначала іх ваенныя абавязкі, права на ваенную здабычу.



З 1940 па 1945 год Ф. М. Нячай працаваў дацэнтам, дэканам гістарычнага факультэта, намеснікам дырэктара Чувашскага пэдінстытута. З 1945 г. лёс вучонага і педагога звязваецца з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Тут Ф. М. Нячай з 1946 па 1953 год працаваў дэканам гістарычнага факультэта, а з 1961 года па 1978 год быў загадчыкам кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў. Дзякуючы яго намаганням быў створаны аддзел антычнага мастацтва ў гістарычным музеі універсітэта, а ў хуткім часе і аддзел гісторыі Старажытнага Усходу. Пад яго кіраўніцтвам студэнты-гісторыкі неаднаразова праводзілі археалагічныя даследаванні Пантыкапея — сталіцы Баспорскага царства.

У 1965 годзе вучоны абараніў доктарскую дысертацыю. Пачатае яшчэ ў аспірантуры гады даследаванне пашыралася ў мностве навуковых артыкулаў і абагульняючай працы «Утварэнне Рымскай дзяржавы» (Мінск, 1972).

У дадатак да аналізу адносін Рыма са сваімі італійскімі саюзнікамі вучоны распрацаваў шэраг праблем, у ліку якіх найважнейшымі з'яўляюцца стварэнне рымскай дзяржавы ў форме Рэспублікі і вырашэнне ў ёй аграрнага пытання. Рым рос і пашыраўся за кошт заваяванняў і рабавання народаў. Спроба палітычных дзеячаў Рыма на чале з братамі Гракхамі ўмацаваць дзяржаву, яе войска шляхам адраджэння праслойкі сялян, надзялення зямлёй і грамадзянскімі правамі саюзнікаў не былі дапушчаны алігархічнымі кругамі Рыма. Браты Гракхі гістарычна аказаліся на шляху гібелі сваіх рэформаў і былі забітыя. Саюзніцкая вайна 91-88 гг. да н. э. і грамадзянская вайна 88-82 гг. скончыліся ўсталяваннем дыктатуры Сулы і гібеллю Рэспублікі.

Працы Ф. М. Нячая застаюцца актуальнымі і ў наш час, таму што яны гістарычна праўдзіва і дэталёва высвятляюць гісторыю царскага і рэспубліканскага Рыма. Беларускі даследчык — адзін з нямногіх антыказнаўцаў ранняй гісторыі Рыма.

**М. КОРЗУН
К. РЭВЯКА
В. ФЯДОСІК**

# Асноўныя мерапрыемствы Беларускага дзяржаўнага універсітэта па падрыхтоўцы і правядзенню святкавання 50-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

**(ЗГОДНА З ЗАГАДАМ РЭКТАРА)**

**1. Стварыць агульнауніверсітэцкую камісію і камісіі на факультэтах па падрыхтоўцы і правядзенню святкавання 50-годдзя Перамогі (студзень-красавік) — адказныя: рэктарат, дэканы, старшыні Саветаў ветэранаў факультэтаў.**

**2. Абнавіць агульнауніверсітэцкі стэнд і стэнды на факультэтах і ў падраздзяленнях, дзе будуць змешчаны фотаздымкі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны (люты-красавік) — адказныя: Савет ветэранаў БДУ, старшыні Саветаў ветэранаў факультэтаў і падраздзяленняў.**

**3. Падрыхтаваць матэрыялы і аформіць кнігу Памяці, прысвечаную ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны — выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам БДУ ( красавік-май) — адказныя: Савет ветэранаў БДУ, старшыні Саветаў ветэранаў факультэтаў і падраздзяленняў.**

**4. Арганізаваць у вестыбюлі фізічнага факультэта дэманстраванне карт ходу баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны і зводак Саўінфармбюро (люты-чэрвень) — адказныя: дэканат, прафбюро і Савет ветэранаў фізфака.**

**5. Правесці агульнауніверсітэцкую навукова-тэарэтычную канферэнцыю прафесарска-выкладчыцкага саставу з удзелам студэнтаў на тэму: «Гістарычныя ўрокі Вялікай Айчыннай вайны» (красавік) — адказныя: дэканат гістарычнага факультэта, кафедры грамадскіх навук.**

**6. Прыняць удзел у рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю Перамогі (красавік-май) — адказныя: дэканат гістфака, кафедры грамадскіх навук.**

**7. На базе гістарычнага факультэта арганізаваць выстаўку «БДУ ў Вялікай Айчыннай вайне» (сакавік-красавік) — адказныя: дэканат гістфака.**

**8. Арганізаваць агульнауніверсітэцкую выстаўку літаратуры аб Вялікай Айчыннай вайне (сакавік-красавік) — адказны: заг. бібліятэкі БДУ.**

**9. Арганізаваць правядзенне экскурсій студэнтаў універсітэта ў Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Хатынь, Курган Славы (люты-май) — адказныя: дэканаты факультэтаў. студэнцкія прафкамы, ваенная кафедра, выхавальнікі, культарганізатары інтэрнатаў.**

**10. Правесці студэнцкі фестываль, прысвечаны 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне: спартыўныя, турысцкія мерапрыемствы, у тым ліку паходы па месцах Баявой Славы (красавік-май) — адказныя: аддзел па справах моладзі, кафедра фізічнага выхавання, ваенная кафедра, выхавальнікі, культарганізатары, спартарганізатары.**

**11. Правесці конкурс-агляд калектываў мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 50-годдзю Перамогі (красавік-май) — адказныя: аддзел па справах моладзі, студэнцкі клуб, выхавальнікі, культарганізатары інтэрнатаў.**

**12. Арганізаваць і правесці з удзелам выкладчыкаў грамадскіх навук універсітэта ў студэнцкіх групах І і ІІ курсаў усіх факультэтаў заняткі, прысвечаныя 50-годдзю Перамогі (сакавік-май) — адказныя: дэканаты, кафедры грамадскіх навук.**

**13. Правесці на факультэтах урачыстыя вечары, прысвечаныя 50-годдзю Перамогі. Арганізаваць шанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны (красавік-май) — адказныя: дэканаты, Саветы ветэранаў факультэтаў, выхавальнікі, культарганізатары інтэрнатаў.**

**14. Правесці агульнауніверсітэцкі вечар, прысвечаны 50-годдзю Перамогі і ўшанаванню ветэранаў (май) — адказныя: рэктарат, прафкам, Савет ветэранаў БДУ.**

**15. Правесці сустрэчы студэнтаў з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны (сакавік-май) — адказныя: дэканаты, Саветы ветэранаў факультэтаў.**

**16. Выпусціць спецыяльны нумар газеты «Беларускі універсітэт», прысвечаны 50-годдзю Перамогі (май) — адказныя: рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт».**

**17. Правесці мітынг з ускладаннем кветак у Стэлы ў двары універсітэта, прысвечаны 50-годдзю Перамогі і памяці выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (май) — адказныя: рэктарат, Савет ветэранаў БДУ, аддзел па справах моладзі, выхавальнікі, культарганізатары інтэрнатаў.**

**18. Наведаць асабістыя кватэры ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ (красавік-май) — адказныя: прафкам студэнтаў, прафкам супрацоўнікаў, Савет ветэранаў БДУ.**

**19. Правесці конкурс на лепшы артыкул і лепшы фотаздымак, прысвечаны 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (сакавік-май) — адказныя: рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт».**

● КАНФЕРЭНЦЫІ

# ПАДУМАЕМ ПРА БУДУЧЫНЮ СЁННЯ

Сёлета адзначае сваё 50-годдзе ААН. З нагоды юбілею намечана правесці кампанію за прыняцце тэрміновых мер для выратавання прыроды і, у выніку, самога чалавецтва. З гэтай мэтай праводзяцца форумы разнастайных неўрадавых, грамадскіх арганізацый.

Так, 18 лютага 1995 г. у гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны прайшла канферэнцыя «Экалагічныя наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС для Рэспублікі Беларусь». Як зменшыць негатыўныя наступствы неразумнай чалавечай дзейнасці, як зберагчы Чалавека, яго здароўе, здароўе нацыі, як узнавіць асяродак нашага існавання, як жыць і выжываць у атамным веку — вось галоўныя праблемы, якія стаялі перад удзельнікамі канферэнцыі. Была таксама дадзена ацэнка глабальным наступствам Чарнобыльскай катастрофы і будучыні атамнай энергетыкі.

Вучні 10—11 класаў гімназіі прынялі ўдзел у канферэнцыі. Яны сабралі, класіфікавалі вялікі матэрыял па экалагічных праблемах, падрыхтавалі спецыяльны выпуск газеты «Эколаг», правялі конкурс экалагічнага плаката, удзельнічалі ў распрацоўцы міжнароднага праекта «Сувязь між энергіяй, развіццём і навакольным асяродкам», былі задзейнічаны ў конкурсе «Лога». На канферэнцыі былі прадстаўленыя даследчыя работы вучняў, абарона творчых праектаў, праведзена дзелавая гульня, у якой спалучаліся займальная форма вядзення дыскусіі з напружанай інтэлектуальнай дзейнасцю па вырашэнню многіх экалагічных праблем.

26 красавіка 1986 года адбылася аварыя на Чарнобыльскай АЭС. У выніку выбуха, разгерметызацыі і пажару на рэактары катастрофа на АЭС суправаджалася выкідам у наваколле не менш за 180 млн. Ku радыёактыўных рэчываў. Мінула ўжо больш за 8 гадоў з таго ракавога дня, калі выбух рэактара на ЧАЭС стаў новай кропкай адліку ў гісторыі развіцця не толькі атамнай энергетыкі, але і ўсёй чалавечай цывілізацыі. Паняцце «мірны атам» пасля аварыі знікла канчаткова. Трагічныя наступствы Чарнобыльскай катастрофы, якія прама ці пабочна адбіліся на лёсах цэлых краін і рэгіёнаў, мільёнаў людзей, наўрад ці сціхнуць у агляднай будучыні. Таму навукоўцы і спецыялісты не спыняюць работу па аналізу прычын, наступстваў Чарнобыльскай катастрофы і пошуку шляхоў іх пераадолення.

Вучнямі была зроблена велізарная работа па збору, аналізу, абагульненню і сістэматызацыі шматлікіх навуковых матэрыялаў. Больш шырока разгледзець асноўныя пытанні канферэнцыі дазволіла аб'яднанне ўдзельнікаў па творчых групах, якія прадстаўлялі думкі фізікаў, хімікаў, біёлагаў, эколагаў, медыкаў, псіхолагаў і эканамістаў. Быў таксама зроблены агляд незалежнай замежнай прэсы. Група фізікаў грунтоўна абмеркавала прычыны аварыі на ЧАЭС і прапанавала версіі:

— неадэкватная культура бяспекі, якая стала прычынай сур'ёзных чалавечых памылак;

— недахопы ў канструкцыі актыўнай зоны рэактара;

— недахопы ў канструкцыі сістэмы спынення рэактара.

Хімікі разгледзелі пытанні, якія тычыліся ўнутранага і вонкавага апраменьвання, уплыву радыяцыі, перадачы радыёнуклідаў па харчовым ланцужку. Найбольш прыступныя да апраменьвання чырвоны касцявы мозг і іншыя органы крывятворнай сістэмы, хрусталік вока і палавыя залозы. Крайне адчувальныя да радыяцыі дзеці. Бо іх тканкі і органы яшчэ растуць, таму для іх асабліва небяспечныя саматычныя мутацыі, выкліканыя апраменьваннем.

Біёлагі паспрабавалі адказаць на пытанне, як звязаны рост агульнага захворвання дарослага і дзіцячага насельніцтва Беларусі з аварыяй на ЧАЭС.

Псіхолагамі былі закрануты складаныя пытанні міграцыі насельніцтва і псіхалагічнай адаптацыі людзей пасля Чарнобыля. Увогуле, перад псіхолагамі стаяла пытанне: ці паўплывала Чарнобыльская катастрофа на псіхалогію людзей? Вялікае сацыялагічнае апытанне, разнастайныя тэсты дапамаглі адказаць ім на пытанні.

Эканамісты распавялі аб вялікім уроне, які нанесла катастрофа эканоміцы Беларусі.

Сапраўдную дыскусію выклікала праблема будучыні атамнай энергетыкі: адны катэгарычна пярэчылі супроць далейшага выкарыстання «мірнага атама», іншыя ж лічылі рызыку апраўданай. Аб'ектыўна былі прадстаўленыя разнастайныя пункты погляду. Гэтаму спрыяла прадастаўленне творчай свабоды, магчымасці беспарашкодна выказваць свой пункт погляду. Спрэчкі аб шляхах прагрэсу былі накіраваныя не толькі супраць ядзернай энергетыкі. Асноўная тэма дыскусіі — шляхі далейшага забеспячэння развіцця тэхнікі, вытворчасці. Удзельнікі канферэнцыі адзначылі, што сонечная энергія і іншыя альтэрнатыўныя крыніцы энергіі выкарыстоўваюцца зараз і будуць выкарыстоўвацца ў будучыні. Блок эколагаў падрыхтаваў цікавыя даклады па выкарыстанню новых відаў паліва, такіх, як вадарод, спірты, маслы, а таксама былі выяўленыя іх істотныя недахопы з хімічнага і эканамічнага пунктаў погляду.

Канешне ж, канферэнцыя не дала адназначных адказаў на мноства пытанняў, што назбіраліся за доўгія атамныя дзесяцігоддзі. Але менавіта такі шлях — шырокія абмеркаванні грамадскасцю — можа паказаць свету выхад з ядзернага тупіка.

* * *

### МЕРКАВАННІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ КАНФЕРЭНЦЫІ

**ДЗЕВОЙНА А. М.— прафесар, доктар тэхнічных навук, галоўны навуковы супрацоўнік інстытута радыяцыйнай бяспекі:**

— Вельмі высокая думка аб канферэнцыі. Хаця гэта і вучэбная канферэнцыя на ўзроўні гімназістаў і школьнікаў, але яна цалкам заслугоўвае назвы навуковай канферэнцыі. Спадабалася, што вучні вельмі сур'ёзна паставіліся да пытанняў экалогіі, радыяцыйнай экалогіі, адчувалася, што выкарыстана вялікая колькасць літаратуры. Мне б хацелася, каб іх здольнасці, якія выявіліся на гэтай канферэнцыі, апраўдаліся і ў далейшым у навуковай і карыснай дзейнасці.

**ЛУК'ЯНІЦА У. В.— супрацоўнік НДІ прыкладных фізічных праблем:**

— Вельмі спадабалася, як канферэнцыя была арганізавана, нават тэатралізавана. Усе выступы вучняў вельмі спадабаліся. Хаця вельмі цяжка за такі малы прамежак часу разгледзець пытанні, датычныя Чарнобыля.

**КРЫКУНОВА ГАННА — вучаніца 11 «А» класа:**

— Больш за ўсё спадабалася сама арганізацыя, зацікаўленасць людзей у правядзенні канферэнцыі. Мне здаецца, што варта праводзіць падобныя канферэнцыі, бо яны шмат змяняюць у свядомасці людзей, прымушаюць нас задумацца аб рэчах, на якія раней не звярталі ўвагі.

**ГАЛУБКОВА ТАМАРА — вучаніца 11 «В» класа:**

— Даклады былі цікавыя і змястоўныя. Спадабаліся актыўныя дыскусіі, а не тое, што было падрыхтавана і крыху нудна гучала. Хацелася б, каб канферэнцыі праводзіліся ў больш вольнай і нязмушанай атмасферы.

**КАВАШЭВІЧ ВАДЗІМ — вучань гімназіі № 1:**

— На жаль, мы яшчэ не маем дастатковага вопыту ў правядзенні падобных канферэнцый, таму, можа быць, нешта не атрымалася. Усё ж лічу, што канферэнцыя ўдалася. Удзельнікі змаглі падабраць патрэбныя матэрыял, падрыхтаваць яго, выступіць і паказаць высокія веды па прадметах.

**ЦЕЛЕХАЎ Я. Г. — выкладчык экалогіі:**

— Вельмі цікавая канферэнцыя. Была падабраная дастаткова рэдкая інфармацыя, якая шмат гаворыць аб разнастайных наступствах Чарнобыльскай катастрофы. Хіба што шмат якія даклады былі перанасычаныя навуковымі тэрмінамі. Але самае галоўнае, што атрымалася дыскусія, якая агаліла галоўную праблему, што стаіць перад Беларуссю,— праблему энергетыкі.

**Вольга БУКАНАВА**

● НАШ КОНКУРС

# Ці будзе музей Другой сусветнай?

***Блізіцца ўжо 50-годдзе Перамогі. Напярэдадні гэтай падзеі пазаштатны карэспандэнт «Беларускага універсітэта» М. Тапіля сустрэўся з вучоным сакратаром Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Алай Георгіеўнай ВАНЬКЕВІЧ і загадчыцай аддзела гісторыі партызанскага руху Раісай Андрэеўнай ЧАРНАГЛАЗАВАЙ.***

**— Хто зараз пераважна наведвае ваш музей?**

**А. Г. Ванькевіч:** —Вы ведаеце, зараз нашымі наведнікамі, як і заўсёды, з'яўляюцца пераважна школьнікі. Для іх мы ладзім і тэматычныя, і аглядныя экскурсіі. Але ў апошнія дні ідзе такі велізарны наплыў наведвальнікаў, што нашыя экскурсаводы проста збіліся з ног.

**— Дарэчы, як зараз вядуцца экскурсіі? Я ведаю, што раней для экскурсаводаў на першым месцы была ідэалагічнасць выкладу падзей, на другім — эмацыйнасць экскурсіі, а на трэцім ужо — інфармацыйнасць...**

**А. Г. Ванькевіч:**

— Вы памыляецеся, у нас ніколі не было такіх хібаў. Іншая справа, што раней строга патрабавалася пры вядзенні экскурсіі выкладаць падзеі так, каб яны лагічна і паслядоўна выцякалі адна з адной. Зразумела, гэта вельмі цяжка. Зараз менш зважаецца на лагічнасць выкладу, а больш — на факталагічнасць.

**— А як з пазіцый цяперашняга дня ў вашым музеі разглядаюцца такія праблемы, як дзейнасць беларускіх нацыянальных арганізацый пры фашыстах?**

**Р. А. Чарнаглазава:**

— Усе гэтыя арганізацыі ўтвараліся з ведама і дазволу немцаў. Так, яны стаялі за нацыянальную ідэю, але фактычна змагаліся супраць свайго ж народа. Я паважаю ў гэтых людзях тое, што яны адстойвалі нацыянальнае адраджэнне, але факты сведчаць аб іх цесным супрацоўніцтве з фашыстамі.

Мы зараз у экспазіцыі далі тэму паліцыі. Не ўсе ж ішлі туды добраахвотна: былі і тыя, хто працаваў на партызанаў, і тыя, хто быў змушаны, хто быў звязаны сям'ёй. Але ж кожнаму не патлумачыш, чаму ты служыш у паліцыі... Між іншым, шмат паліцэйскіх пераходзіла да партызанаў...

*Кажуць, развіццё чалавецтва адбываецца па спіралі. І так ці іначай яно вымушана звяртацца да падзей, якія сталіся для яго вызначальнымі. Мы, відаць, яшчэ не раз звернемся да гісторыі Другой сусветнай вайны. Бо для Беларусі была яна менавіта Другой сусветнай, а не толькі Вялікай Айчыннай. Бо вайна гэтая пачалася для Беларусі ў 1939 годзе, калі савецкія войскі, паводле сакрэтнай дамовы Молатава-Рыбентропа, парушылі польскую мяжу і ўвайшлі ў Заходнюю Беларусь.*

*Мінае час, мяняемся мы, мяняюцца нашыя ацэнкі гістарычных падзей. Можа, не такі ўжо далёкі той час, калі Беларускі Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны стане музеем гісторыі Другой сусветнай?*

# УЗГАДВАЮЧЫ СЯБРА

У сакавіку бягучага года спаўняецца 40 гадоў Юрыю Уладзіслававічу Цішыну, дацэнту кафедры вышэйшай алгебры, таленавітаму навукоўцу, апантанаму педагогу, спартсмену, надзейнаму таварышу і нашаму сябру. Пісаць аб ім даводзіцца, на жаль, у мінулым часе, але зварот да сваёй памяці дае толькі ясныя і жывыя карціны аб гэтым чалавеку.

Юрый Уладзіслававіч вельмі любіў сваю работу. Гэта не банальнасць, бо без такой любові нельга ў 35 гадоў выконваць абавязкі загадчыка кафедры, нельга плённа займацца навуковымі даследваннямі, мець шматлікія публікацыі ў аўтарытэтных навуковых часопісах. Яго навукай, нагадаем, была алгебра. І яшчэ нагадаем словы філосафа, які казаў, што чым абстрактней навука, якой ты збіраешся займацца, тым мацней трэба забіць ёю свае пачуцці.

Да сваіх выкладчыцкіх абавязкаў Юрый Уладзіслававіч ставіўся больш чым прынцыпова. Гэта тычыцца не толькі якасці лекцый, практычных заняткаў, метадычных распрацовак, пастаяннага кіраўніцтва навуковай работай студэнтаў. Гэта тычыцца і надзвычай клапатлівага стаўлення да сяброў-калег. Мы памятаем, як ён без усялякіх папярэджванняў і просьб прыходзіў да пачатку заняткаў свайго сябра, падрыхтаваны яго падмяніць, толькі прадчуваючы, што той можа спазніцца праз складаныя жыццёвыя абставіны.

Цяпер ясней, чым раней, відаць галоўную мэту Юрыя Уладзіслававіча — самаўдасканаленне для навакольных людзей. Многія супрацоўнікі універсітэта памятаюць слайд-вечарынкі і фотавыставы, якія ён, цудоўны фатограф, арганізоўваў. Шчыры і разумны чалавек, ён у зносінах з сябрамі і калегамі шукаў духоўнага збліжэння, звяраў правільнасць сваіх уяўленняў пра жыццё і часам смела іх карэктаваў. Але, вызначыўшы сваю ісціну, Юрый Уладзіслававіч заўсёды жыў у згодзе з ёй. А яшчэ была ў яго душы струна чалавека-рамантыка, вялікага жыццялюба. Аднак, відаць, болей за жыццё любіў ён горы.

Горы былі ягонай страсцю: аднойчы пабачыўшы іх і ўдыхнуўшы іх паветра, ён кожнае лета праводзіў з рукзаком за спіной і ледарубам у руках. Значныя яго спартыўныя дасягненні: чэмпіён і прызёр Беларусі па горнаму турызму, ён здзейсніў шэраг вельмі складаных спартыўных паходаў па Каўказу і гарах Таджыкістана. Не аднойчы арганізоўваючы вандроўкі ў горы, Юрый Уладзіслававіч прыцягнуў да турызму сваіх сяброў і знаёмых, у іх ліку многіх супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ.

Гэта няпраўда, што пабываўшы ў гарах, чалавек абавязкова захворвае імі на ўсё жыццё. Паходы ў горы беспамылкова пакідаюць у шэрагах сваіх прыхільнікаў людзей глыбока прыстойных, сумленных, з вельмі вялікім пачуццём адказнасці за таварышаў і за даручаную справу.



*Ю. У. Цішын: цяжар рукзака быў яму звыклым*

40 гадоў — не юбілей сталасці, не той узрост, калі звычайна падводзяць у жыцці галоўныя вынікі. Але да гэтага юбілею даводзіцца падыходзіць з іншымі меркамі: летам 1990 года на спуску з перавала Міралі ў Фанскіх гарах здарылася непапраўнае... Без сумнення, паспеў Юрый Уладзіслававіч зрабіць нямала. Высокай была і назаўжды застанецца яго нота ў жыцці.

У гэтым жыцці, якое шмат у чым не мяняецца да лепшага, зваротаў да мінулага не пазбегнуць. Есць у гэтым мінулым людзі, якіх нам зараз не хапае. Аб якіх памятаем.

**У. В. СУВОРАЎ, А. П. ШЫЛІН, дацэнты БДУ**

# Некалькі слоў пра «Феміну»

Нам, студэнтам журфака, давялося рыхтаваць вучэбную тэлевізійную праграму. Мы назвалі яе «Femina», што ў перакладзе з лацінскай мовы значыць — Жанчына...

Погляд кожнай жанчыны на свет своеасаблівы і непаўторны. У любы час, незалежна ад абставін і рэчаіснасці, якая навокал, жанчына імкнулася ўбачыць і прыўнесці ў свет прыгажосць і гармонію. Шмат стагоддзяў Жанчына натхняла Мастакоў на стварэнне цудоўных вобразаў.

А з развіццём цывілізацыі жанчына стала займаць больш месца ў свеце. Бадай, няма такога занятку на Зямлі, у якім жанчына не паспрабавала, даказваючы мужчыне сваю перавагу. І ў той самы час застаючыся пяшчотнай, ласкавай асобай. У чым яе таямніца? У чым таямніца жаночага погляду на свет? Можа, жаночым поглядам можна глядзець толькі на мужчыну? Спадзяемся, што гэта не так, інакш розніца паміж мужчынам і жанчынай з'явілася б толькі ў адносінах з процілеглым полам.

І вось некалькі дзяўчынак, будучых журналістак, у канцы XX стагоддзя паспрабавалі прыадкрыць завесу дзіўнага, таямнічага свету жанчын. Як спалучаюцца ў ёй дзелавая жанчына і маці, мэтанакіраванасць і каханне, сіла волі і мяккасць характару — вось аб чым паспрабавалі яны распытаць у жанчын: **псіхолага Надзеі Аляксандраўны ЦВІГУН, рэжысёра Валянціны Рыгораўны ЕРАНЬКОВАЙ, актрысы Святланы ТАМЫ.**

**— Надзея Аляксандраўна, пра жанчын кажуць, што яны заўжды любяць даваць парады. Як атрымалася, што Вы сталі прафесійнай дарадчыцай?**

— Я не скончвала школу. Аднак я скончыла музычнае вучылішча. Потым я скончыла філасофскі факультэт, а потым аспірантуру па псіхалогіі. Да сваёй сённяшняй спецыяльнасці я прыйшла выпадкова.

**— Валянціна Рыгораўна, а не цяжка жанчыне быць рэжысёрам?**

— Я ніколі не дзяліла свой пол і прафесію. Ад гэтай прафесіі я атрымліваю задавальненне. Я доўгі час працавала актрысай у Тэатры юнага гледача і сутыкнулася з праблемай, калі адчула, што мой творчы патэнцыял яшчэ вялікі, я яшчэ магу рэалізаваць сябе як актрысу, таму што прыйшло разуменне прафесіі. Веды і вопыт жыцця аднаюцца на сцэне. Аднак мы граем для дзяцей, і ўзроставая я не адпавядаю той або іншай ролі. І калі наступіў гэты момант, я адчула, што мне трэба як-небудзь рэалізавацца ў нечым іншым. Я пачала выкладаць у інстытуце культуры, потым зразумела, што і гэтага мне мала, і гэта, напэўна, не маё. Я пайшла па шляху рэжысуры, пачала прапаноўваць работы сваім студэнтам. Мы збіраліся па вечарах, разбіралі спектаклі, работы і спыніліся на адным з матэрыялаў — «История любви Полосатого Кота и сеньориты Ласточки».

**Святлана Тама:** У мяне шмат розных карцін. У акцёра павінна быць шмат добрых роляў. Аднак ёсць нейкая адна, па якой цябе запамінаюць і якая быццам становіцца тваёй візітоўкай. Вось, пэўна, гэтым для мяне стала карціна «Табор уходит в небо».

*Што і казаць, жыццё жанчыны шматграннае. Праца займае больш часу, але частка душы заўжды належыць любімаму чалавеку і дзецям.*

**Надзея Цвігун:** Мае веды дапамагаюць мне ў адносінах з маім сынам. Аднак гэтымі ведамі трэба карыстацца вельмі асцярожна, інакш можна пачаць маніпуляваць людзьмі, а гэта этычна недапушчальна. Ёсць этычны кодэкс псіхолага аб ведах і ўменнях, якія табе даступныя, але імі нельга карыстацца.

**Святлана Тама:** Так, безумоўна, у мяне ёсць дзеці. Дарослая дачка. Актрыса, працуе ў «Современнике». Яна катэгарычна адмовілася ад прозвішча Тама, носіць прозвішча бацькі — Іра Лачына.

**— Цяжка, калі ў хаце дзве актрысы?**

— У мяне яшчэ зяць — акцёр. У нас акцёрская сям'я, і наадварот — вельмі лёгка і выдатна, таму што ў нас агульныя тэмы. Мы ўвесь час гаворым аб прафесіі. Ірына і Алег заняты ў спектаклі «Цень» у тэатры на Таганцы па п'есе І. Шварца. Прыходзяць з рэпетыцыі, абмяркоўваюць яе, а я са свайго боку распавядаю пра рэжысёра, у якога здымалася, або пра канцэрты. Увесь час — размова пра прафесію. Мяне разумеюць, я разумею...



*А яшчэ жанчына вельмі тонка адчувае розніцу ў светаразуменні і ўспрыняцці дарослага і дзіцяці. Гэта мы адчулі ў размовах з Валянцінай Рыгораўнай. Бо спектакль, які паставіла яна па казках Бісета «Забыты Дзень нараджэння», прызначаны дзецям.*

**Валянціна Еранькова:** Дарослыя прыходзяць на спектакль засмучаныя цяжкасцямі жыцця. Здаецца, субота і нядзеля — адзіны час для сябе, а тут трэба ісці ў тэатр, каб даць дзіцяці нейкую культурную праграму. Дзеці ж наадварот святочныя, для іх тэатр — сустрэча з казкай, з цудам. А дарослыя ідуць са своеасаблівым багажом тыдня. І раптоўная трансфармацыя, якая з імі адбываецца падчас спектакля, каштуе мне вельмі дорага. Я назіраю, як на сярэдзіне спектакля іх твары квітнеюць, становяцца прыгожымі, замілаванымі, цікавымі.

**— А які ён, па-вашаму, прыгожы чалавек?**

— Прыгожы чалавек — гэта паняцце вельмі цяжкое... Гэта, напэўна,— па духоўных якасцях: духоўна багаты чалавек, гарманічны чалавек. Прыгажосць перш за ўсё ў гармоніі...



*Мабыць, у сённяшнім нашым жыцці не хапае менавіта гармоніі. І не хапае гармоніі ў нас саміх. Што мы шукаем, да чаго імкнемся, якія каштоўнасці для нас сёння важней за ўсё?*

**Надзея Цвігун:** Каштоўнасці — гэта тое, што ты выбіраеш у апошні момант свайго жыцця. Уявіце, Вам засталося жыць апошнія суткі. Чым Вы зоймецеся, аб чым падумаеце, што зробіце? Чаму прысвеціце апошнія гадзіны свайго жыцця — гэта і ёсць сапраўдныя каштоўнасці.

Самае цяжкое — гэта шукаць адказ на пытанне. Жыццё — гэта і ёсць працэс пошуку. Калі ты знайшоў нешта адно, здаецца, толькі што ты нешта заваяваў і зразумеў, а жыццё змянілася. Кожны раз трэба сувымяраць з прынцыпамі, якія ёсць унутры цябе. Напрыклад, у якой ступені ты можаш быць праўдзівым. Сказаць чалавеку, што ён павінен заўжды быць сумленным,— гэта значыць, паставіць яго ў вельмі жорсткія рамкі. Або — можна хлусіць колькі заўгодна. Гэта пазіцыя амаральная, і ў ёй, дарэчы, чалавек доўга не зможа пражыць. Кожны шукае ступень, дзе схлусіць, а дзе быць абсалютна праўдзівым. Кожны адказвае ўнутры сябе. Сумленне — гэта і ёсць унутранае пачуццё.

**Валянціна Еранькова:** Мне ўжо нешта адкрылася ўнутры сябе. Я не скажу, што гэта дар прадбачання або прароцтва, не. Аднак на інтуітыўным узроўні я адчуваю чалавека...

*На гэтых словах скончваецца наша тэлевізійная праграма. Ставім кропку і зараз. Толькі хочацца, каб яшчэ прагучала прыгожая вясновая музыка.*

**Ю. ВАСІЛІШЫНА**
**К. ТКАЧЭНКА**




*Маляваў ужо вядомы чытачам нашай газеты Опричь КРОМЕШНИЙ.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
ЗАСНАВАЛЬНІК ГАЗЕТЫ — РЭКТАРАТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

14 сакавіка. Зак. 652. Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара Т. М. КАЗАК